

# Кацяш Вера Пятроўна

За гады работы на комплексе па дарошчванні і адкорме буйной рагатай жывёлы КСУП «Гервяты» Вера Кацяш падгадавала не адну тысячу бычкоў і цялушак. У сваёй нялёгкай, але такой незаменнай у сельскай гаспадарцы працы жанчына не бачыць нічога звышнатуральнага, маўляў, такая, як і ўсе… Такая ж, але і адрозная! Ледзь не штогод у групе жанчыны найлепшыя прывагі. Вера Пятроўна – неаднаразовы пераможца раённага сельскагаспадарчага спаборніцтва, яе партрэт змешчаны на Дошцы гонару, а летась падчас абласнога свята «Чалавек года Гродзеншчыны» жанчыне ўручылі медаль «За працоўныя заслугі». Нагод для знаёмства з перадавой працаўніцай хоць адбаўляй.

## Па працы – і ўзнагароды

З Верай Пятроўнай сустрэліся на яе працоўным месцы – у цялятніку, дзе ў розных клетках, у залежнасці ад узросту, камплекцыі і вагі, стаіць 185 бычкоў і цялушак. Накормленыя і напоеныя цяляты не звярталі на нас ніякай увагі. Размову пачалі не з традыцыйных пытанняў пра дзяцінства і сям'ю, а пра ўражанні жанчыны, якія пакінулі цырымонія ўзнагароджвання ў Гродне і сустрэча з Прэзідэнтам у Мінску.

Вядома, перажывала і хвалявалася, але родныя і дзяўчаты з работы вельмі падтрымалі. У 2022 годзе на сустрэчу з Аляксандрам Лукашэнкам паехала толькі тры чалавекі. Бачыць яго па тэлевізары і на свае вочы – вялікая розніца.

Наш Прэзідэнт – сапраўдны, шчыры, разумны, а галоўнае – чалавек ад зямлі. Таму так паважае і цэніць даярак, жывёлаводаў, трактарыстаў. Хто яшчэ запрашае да сябе на сустрэчу, апроч міністраў і кіраўнікоў, простых людзей? Толькі Лукашэнка. Спадабалася мерапрыемства, уразіў Палац Незалежнасці, – успамінае падзеі Вера Пятроўна.

– У мінулым годзе з нашай канторы мне паведамілі, што Прэзідэнт падпісаў Указ аб узнагароджванні медалямі і Падзякамі некалькі дзясяткаў чалавек па ўсёй Беларусі. Літаральна праз месяц атрымала медаль у абласным цэнтры з рук Леаніда Зайца. Прыемна, словамі не перадаць! Удзячна кіраўніцтву нашага калгаса і раёна, што заўважылі і так высока ацанілі маю работу.

Значнымі для Веры Пятроўны сталі віншаванні родных і блізкіх. Унукі жанчыны, праходзячы з бацькамі ля раённай Дошкі гонару, заўсёды радасна і адначасова важна зазначаюць: «Гэта наша бабуля!»

### Астравеччына – другая радзіма

Гервяцкі край бадай што самы шматнацыянальны ў нашым раёне. Акрамя літоўцаў, там кампактна пражываюць і ўкраінцы, якія некалькі дзесяцігоддзяў назад пераехалі сюды цэлымі сем’ямі.

– У Гервяты паехала за мужам, 19 гадоў мне было. У той час многія мужчыны вахтамі працавалі будаўнікамі ў Беларусі. Мікалаю тут спадабалася, маўляў, і прырода прыгожая, і людзі спагадлівыя – самае месца для жыцця, – успамінае Вера Пятроўна. – Праз год, як грымнуў Чарнобыль, з Ровенскай вобласці да нас пераехалі мае маці, брат і сястра.

Тагачасны старшыня калгаса Вячаслаў Адахоўскі выдзеліў маладым невялікую хацінку, ад якой ужо нават і знаку не засталося. Пазней, праўда, прапаноўваў жыллё на вуліцы Маладзёжнай, але Кацяшы адмовіліся і самі пабудавалі дом у Міцюнах.

– Работы па спецыяльнасці (я повар) у вёсцы не знайшлося. Да дэкрэтнага адпачынку працавала ў падсобным цэху. Калі дачушцы год сышоў, выйшла на работу сюды – з таго часу і працую. Малую глядзелі суседкі-пенсіянеркі, жанчыны добрай душы – Марыя і Яніна, – працягвае працаўніца.

– Гэты комплекс будаваўся пры Вячаславе Іосіфавічы напачатку 80-х гадоў. Начальнікам быў Андрэй Андрэевіч Галагаеў. Мая свякруха, дарэчы, адна з першых набірала тут групы. Гервяцкі комплекс па адкорме і дарошчванні быкоў і цялушак – гэта шэраг жывёлагадоўчых памяшканняў. У адной з секцый шмат гадоў гаспадарыць мая суразмоўца.

– Цяпер у мяне 185 цялят. У секцыю яны трапляюць у двухмесячным узросце вагой каля 80-90 кілаграмаў. За паўгода павінны набраць да 250 ці больш, потым іх пераводзяць у цэх адкорму, – расказвае пра работу цялятніца. – Напачатку з малышамі складана, яны ж прывучаныя да сосак і вядзерцаў, не разумеюць, як піць. Таму даводзіцца залазіць у клетку, падводзіць малога да паілкі і вучыць. На іх адаптацыю патрэбен месяц. Спачатку цялятам даём сена, розныя дабаўкі. Пазней развозім кормасумесь. Уручную трэба набраць і раздаць каля 3 тон, ці 20 тачак. А яшчэ пачысціць паілкі, кармушкі, праходы. У другой палавіне дня ўсё паўтараецца.

У 12 секцыях цэха дарошчвання працуюць выключна жанчыны. Некаторыя з іх ужо выйшлі на заслужаны адпачынак, у тым ліку і Вера Кацяш, але не могуць кінуць сваіх гадаванцаў.

– Наша работа, канешне, складаная, але ж некаму трэба працаваць, – разважае жанчына з Дошкі гонару. – У наступным годзе будзе 40 гадоў як Астравеччына стала для мяне другой радзімай. У маладосці нават і не падумала б, што буду цялятніцай, але жыццё ўсё размеркавала на свой лад. Нездарма ж людзі кажуць, што не месца ўпрыгожвае чалавека, а чалавек. Ім і трэба заставацца – і з людзьмі, і з жывёламі…

Валянціна Мажэйка, начальнік комплексу па дарошчванні і адкорме буйной рагатай жывёлы:

– Вера Пятроўна вельмі старанны і добрасумленны работнік, сапраўдны чалавек працы. Толькі глянуўшы на жывёлу, на вока можа вызначыць вагу цяляці – не памыліцца. Яна столькі гадоў на адным месцы, таму цалкам заслужана трапіла на раённую Дошку гонару.

https://www.ostrovets.by/
Текст: Алена Ганулiч